**Пленарная дыскусія**
**Plenary Discussion**

**Sala Ratuszowa, Pałac Kultury i Nauki, plac Defilad 1**

**Пятніца, 15 верасня**
**Friday, September 15th**
**10.10-13.00**

Дыскусія
***"Рэвалюцыя 1917 году і досвед камунізму для Цэнтральна-Усходняй Еўропы"***
Удзельнікі: Фелікс Акерман, Томас Бон, Уладзімір Мацкевіч.
Мадэратар – Аляксей Ластоўскі.

100 год таму адбылася камуністычная рэвалюцыя, якая на працягу XX стагоддзя значна змяніла ўвесь рэгіён Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Нягледзячы на распад камуністычнай сістэмы напрыканцы мінулага стагоддзя, яе палітычныя і культурныя наступствы нельга лічыць пераадоленымі. Мэта дыскусіі зразумець: Што досвед і спадчына камунізму значыць для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы? Якім чынам ён працягвае ўплываць на культурнае і палітычнае развіццё рэгіёну? Якія выклікі гэты досвед і спадчына нясуць для краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы?
У другой частцы дыскусіі прапануецца абмеркаваць наступныя пытанні: якія канцэптуальныя схемы лепш зараз прымяняць для апісання камунізму? ці практычная тэорыя таталітарызму для гістарыі камунізму? ці з'яўляўся камунізм навязанай звонку ідэяй для Усходняй Еўропы ці ўсё ж мы мусім разглядаць яго як вынік унутранага развіцця? ці мае сэнс параўнанне (ураўнаванне) камунізму і нацызму?

Discussion
***"The Russian Revolution of 1917 and the experience of communism for Central and Eastern Europe"***
Participants: Felix Ackermann, Thomas Bonn, Uladzimir Mackievič.
Moderator: Aliaksiej Lastoŭski

The communist revolution, which took place 100 years ago, significantly changed the whole region of Eastern and Central Europe during the 20th century. Despite the collapse of the communist system, its political and cultural implications still have not been overcome. The discussion will focus on the following problems: What do the experience and legacy of communism mean for Central and Eastern Europe? How do they continue to influence the cultural and political development of the region? What challenges do the communist experience and heritage pose for the countries of Central and Eastern Europe?
What conceptual schemes should we use for describing communism? Is the theory of totalitarianism applicable to the history of communism? Was communism imposed on Eastern Europe as an external idea and or it can be viewed as the result of internal development? Can we compare (and equalise) communism and Nazism?

**Фелікс Акерман** – нямецкі гісторык, аўтар манаграфіі “Палімпсест Гародня” (2010). У 2011-2016 гг. узначальваў Цэнтр нямецкіх даследаванняў пры Еўрапейскім гуманітарным універсітэце ў Вільні. З 2106 году працуе ў Нямецкім гістарычным інстытуце ў Варшаве.
**Томас Бон** – нямецкі гісторык, аўтар манаграфіі “Мінскі феномен” (2008, у беларускім перакладзе – 2016). Прафесар Гісэнскага ўніверсітэта. Рэдактар серыі кніг, прысвечаных беларускай гісторыі. У дадзены момант працуе над даследчым праектам пра Белавежскую пушчу.
**Аляксей Ластоўскі** – беларускі сацыёлаг. Супрацоўнік Інстытута “Палітычная сфера”, адзін з арганізатараў Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі. Дацэнт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Кіраўнік аддзялення гісторыі Беларускага Калегіюма.
**Уладзімір Мацкевіч** – беларускі метадолаг і філосаф. Заснавальнік і кіраўнік Агенцтва гуманітарных тэхналогій. Заснавальнік праграмы “Лятучы ўніверсітэт”.

**Felix Ackermann** is a German historian and author of the monograph “*Palimpsest Grodno. Nationalisierung, Nivellierung und Sowjetisierung einer mitteleuropäischen Stadt 1919–1991*” (2010). In 2011-2016 he headed the Center for German Studies at the European Humanities University in Vilnius. Since 2016 he has been working at the German Historical Institute in Warsaw.
**Thomas Bohn** is a German historian and author of the monograph “*Minsk – Musterstadt des Sozialismus. Stadtplanung und Urbanisierung in der Sowjetunion nach 1945”* (2008, in Belarusian translation 2016). He is a professor at the Justus-Liebig-Universität Gießen and editor of a series of books dedicated to the history of Belarus. Currently he is working in a research project on the Białowieża Forest.
**Aliaksiej Lastoŭski** is a Belarusian sociologist and researcher at the Institute ‘Political Sphere’, one of the organizers of the International Congress of Belarusian Studies. He is also an associate professor of Polack State University and head of the Department of History of the Belarusian Collegium.
**Uladzimir Mackievič** is a Belarusian methodologist and philosopher, founder and head of the Agency for Humanitarian Technologies, founder of the Flying University project.